ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ
І ПРАФКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 4 (491) | Субота, 13 лютага 1982 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## ЛАЎРЭАТЫ ПРЭМІІ КАМСАМОЛА ГОМЕЛЬШЧЫНЫ

Вакальна-інструментальны ансамбль студэнтаў універсітэта «Радзімічы» добра вядомы ў нашай вобласці, рэспубліцы. Выступленні ансамбля ўпрыгожваюць праграмы мастацкай самадзейнасці, становяцца падзеяй пры самастойных выступленнях. Вызначаюць яго высокая мастацкая культура, глыбокае разуменне сучасных музыкальных цячэнняў, арыентацыя на лепшыя ўзоры.

Нядаўна вакальна-інструментальнаму ансамблю «Радзімічы» па выніках 1981 года прысуджана прэмія камсамола Гомельшчыны сярод творчай моладзі ў галіне літаратуры, мастацтва, журналістыкі і архітэктуры. Як адзначана ў рашэнні журы, прэмія прысуджана «...за вялікую шматгадовую работу па маральна-эстэтычнаму выхаванню моладзі, культурнае абслугоўванне ўдарных камсамольскіх будоўляў».

(Наш. кар.).

*На пашыраным пасяджэнні Савета універсітэта*

# ПАЎНЕЙ ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ МАГЧЫМАСЦІ

25 студзеня адбылося пашыранае пасяджэнне Савета універсітэта. Разам з яго членамі ў актавай зале сабраліся вучоныя, выкладчыкі, навукова- і інжынерна-тэхнічны персанал навукова-даследчага сектара і праблемнай навукова-даследчай лабараторыі. Асноўным на парадку дня было пытанне па падвядзенню вынікаў навукова-даследчай, вучэбнай і вучэбна-метадычнай работы і падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў за 1981 год. З грунтоўнымі дакладамі выступілі прарэктар па навуковай рабоце прафесар **М. В. Навучыцель**, прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар, член-карэспандэнт АН БССР **Л. А. Шамяткоў**, прарэктар па завочнаму і вячэрняму навучанню дацэнт **А. І. Балтоўскі**.

Актуальнасць, абмяркоўваемага пытання выклікала актыўныя, дзелавыя і прынцыповыя спрэчкі. У іх прынялі ўдзел загадчык навукова-даследчага сектара **М. І. Твардоўскі**, загадчык кафедры оптыкі дацэнт **А. М. Сердзюкоў**, загадчыца вучэбнай часткі **Н. І. Папкова**, намеснік загадчыка НДС **С. Я. Пашук**, загадчык кафедры фізічнай метралогіі дацэнт **У. М. Школдзін**, дацэнт кафедры фізіялогіі спорту і спартыўнай медыцыны **І. П. Волкаў**. Падагульняючым з'явілася выступленне рэктара універсітэта акадэміка АН БССР **Б. В. Бокуця**.

У ДАКЛАДАХ і заслуханых выступленнях, падкрэслівалася, што на працягу першага года адзінаццатай пяцігодкі калектыў універсітэта працаваў над ажыццяўленнем рашэнняў XXVI з'езда КПСС і XXIX з'езда КПБ, пастаноў партыі і ўрада па вышэйшай школе, выкананню патрабаванняў Міністэрстваў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі краіны і рэспублікі.

У мінулым годзе ва універсітэце прыкметна павысілася значнасць дзяржбюджэтнай і гаспдагаворнай тэматыкі. У плане НДР 1981 года доля важнейшай дзяржбюджэтнай тэматыкі дасягнула 91,5%, у тым ліку выконваемай па комплексных праграмах — 44,7 %. Па гаспдагаворнай тэматыцы гэтыя паказчыкі таксама характарызуюцца пэўным ростам.

Дзяржкамітэт СМ СССР па навуцы і тэхніцы зацвердзіў дадатковую тэматыку, павялічыў штат работнікаў і асігнаванні праблемнай навукова-даследчай лабараторыі фізіка-хімічных працэсаў трэння.

Адкрыта і працуе другая ва універсітэце галіновая навукова-даследчая лабараторыя комплекснага вывучэння мінеральна-сыравінных рэсурсаў Беларусі.

У навукова-даследчай рабоце летась удзельнічала 553 навукова-даследчыя работнікі, у тым ліку 15 доктараў і 193 кандыдаты навук.

Як адзначалася ў дакладзе М. В. Навучыцеля, найбольш значныя вынікі даследаванняў дасягнуты за мінулы год на кафедры гісторыі КПСС, навуковага камунізму, філасофіі, беларускай мовы, рускай мовы, алгебры і геаметрыі, дыферэнцыяльных ураўненняў, тэорыі функцый і функцыянальнага аналізу, тэарэтычнай фізікі, фізікі цвёрдага цела, оптыкі, мінералогіі, петраграфіі і геахіміі, гідрагеалогіі і інжынернай геалогіі, фізіялогіі чалавека і жывёлін, хіміі, агульнай фізікі, радыёфізікі, матэматычных праблем кіравання, тэхнічных сродкаў апрацоўкі эканамічнай інфармацыі, ВМ і праграмавання, праблемнай НДЛ фізіка-хімічных працэсаў трэння.

За мінулы год вучонымі універсітэта было выдадзена 5 манаграфій, вучэбных дапаможнікаў. Іх аўтарамі з'яўляюцца Я. М. Шарамет, Л. М. Сапегін, У. І. Міроненка, А. Я. Малахава, В. П. Дзядзічкін.

У дакладзе і выступленнях указвалася на якаснае паляпшэнне навукова-даследчай работы студэнцкай моладзі. Усімі формамі НДРС было ахоплена 96% кантынгенту стацыянара. На рэспубліканскім аглядзе-конкурсе студэнцкіх навуковых прац па прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навуках 74,3 працэнта прадстаўленых ад ГДУ даследаванняў аднесены да першай і другой катэгорый. На Усесаюзным конкурсе работа студэнта гісторыка-філалагічнага факультэта В. Пічукова ўдастоена медаля, 5 даследаванняў адзначаны дыпломамі Мінвуза СССР і ЦК ВЛКСМ і аўтары такой жа колькасці работ узнагароджаны Ганаровымі граматамі конкурсных камісій. 49 работ студэнтаў і ў сааўтарстве з выкладчыкамі апублікаваны ў друку.

За першы год адзінаццатай пяцігодкі павысіўся якасны ўзровень прафесарска-выкладчыцкага саставу.

Працэнт выкладчыкаў з вучонымі ступенямі дасягнуў 46,9%. Паспяхова закончылі аспірантуру 72,7% аспірантаў. Былі абаронены доктарская дысертацыя дацэнтам В. П. Стаўровым і 10 — кандыдацкіх. Загадчык кафедры філасофіі доктар філасофскіх навук У. М. Калмыкоў і загадчык кафедры эканомікі працы У. Д. Арэшчанка зацверджаны ВАКам у вучоным званні прафесара.

Калектыў універсітэта накіроўваў свае намаганні на ўдасканальванне зместу і форм вучэбна-метадычнай і выхаваўчай работы. Як адзначалася ў дакладзе Л. А. Шамяткова, працягвалася работа па распрацоўцы праграм новых спецкурсаў, рэгулярна абмяркоўваліся тэксты лекцый. За справаздачны перыяд ратапрынтным спосабам выдадзена 13 вучэбных дапаможнікаў агульным аб'ёмам 81,5 друкаванага аркуша.

Мэтанакіравана вялася работа па ўдасканальванню псіхолага-педагагічнай падрыхтоўкі выкладчыкаў. Працягваў плённа працаваць семінар па праблемах вузаўскай педагогікі і псіхалогіі. Для актывізацыі логіка-мысліцельнай дзейнасці студэнтаў практыкавалася правядзенне заняткаў на аснове праблемнага навучання.

За перыяд навучальнага года з іншых ВНУ і навукова-даследчых устаноў краіны для чытання лекцый і аказання дапамогі ў правядзенні навукова-даследчай работы ва універсітэт прыязджала 5 вядомых вучоных.

На пасяджэнні Савета разам з дасягнутымі поспехамі адзначаліся і меўшыя месца недахопы ў арганізацыі навукова-даследчай, вучэбнай і вучэбна-метадычнай работы, у падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў. Яшчэ не ўся дзяржбюджэтная тэматыка ўвайшла ў лік важнейшых. Застаецца нізкім працэнт гаспдагаворнай тэматыкі, у асаблівасці па комплексных праграмах. Эканамічны эфект у разліку на рубель затрат на навуку ад укаранення закончаных распрацовак у вытворчасць ва універсітэце застаецца ніжэйшым сярэдняга паказчыка па Мінвузу БССР. Знізілася выдавецкая актыўнасць прафесарска-выкладчыцкага саставу. Слабым звяном застаецца і вынаходніцкая работа. Не па ўсіх ахоўвадздольных тэмах праведзены патэнтна-інфармацыйныя даследаванні. Застаецца высокім працэнт адхіленых заявак на стадыі папярэдняй экспертызы. Ні адно вынаходніцтва не ўкаранёна ў вытворчасць.

Маюць месца недахопы ў арганізацыі навукова-даследчай работы студэнтаў. Слаба прыцягваецца да кіраўніцтва студэнцкай навукова-тэхнічнай творчасцю навуковы і інжынерна-тэхнічны персанал НДС і праблемнай навукова-даследчай лабараторыі. Якасць студэнцкіх навуковых прац, якія адпраўляюцца на рэспубліканскія агляды-конкурсы, практычна не павышаецца. Усё яшчэ высокі працэнт даследаванняў, аднесеных да трэцяй катэгорыі, а 1,34 працэнта іх былі адхілены.

На пасяджэнні Савета адзначаліся выпадкі нізкай патрабавальнасці да аспірантаў з боку кафедр і навуковых кіраўнікоў. У выніку гэтага асобныя аспіранты пасля аспірантуры доўгі час не абараняюць кандыдацкія дысертацыі. Ва універсітэце мала рыхтуецца доктарскіх дысертацый.

Мелі месца істотныя недахопы і ў арганізацыі вучэбнай і вучэбна-метадычнай работы. На кафедрах і факультэтах яшчэ мала ўдзяляецца ўвагі актыўнаму ўкараненню ў вучэбны працэс тэхнічных сродкаў навучання, распрацоўцы метадычных дапаможнікаў па ТСН. Да гэтага часу не запушчана ў дзеянне лабараторыя вучэбнага тэлебачання. Адзначаліся таксама выпадкі парушэння раскладу вучэбных заняткаў, выканання рабочых планаў факультэтаў.

Савет універсітэта прыняў разгорнутую пастанову, накіраваную на далейшае паляпшэнне навукова-даследчай, вучэбнай і вучэбна-метадычнай работы, падрыхтоўку навукова-педагагічных кадраў, паспяховае ажыццяўленне задач, пастаўленых перад вышэйшай школай XXVI з'ездам КПСС.

На пасяджэнні Савета рэктар універсітэта Б. В. Бокуць уручыў нагрудныя знакі «За выдатныя поспехі ў рабоце» Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і Цэнтральнага камітэта прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навучальных устаноў узнагароджаным дацэнтам Г. С. Еўдакіменку з кафедры гісторыі СССР і ўсеагульнай гісторыі, М. С. Кісялёвай з кафедры батанікі і фізіялогіі раслін і А. Н. Бекарэвічу з кафедры матэматычнага аналізу.

*Партыйнае жыццё*

## ТЭХНІЧНЫЯ СРОДКІ— У ВУЧЭБНЫ ПРАЦЭС

Галоўнай задачай вышэйшай школы на сучасным этапе, як вызначыў XXVI з'езд КПСС, з'яўляецца павышэнне ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў на аснове паляпшэння якасці выкладання вывучаемых дысцыплін. Адным з важнейшых кампанентаў інтэнсіфікацыі навучання лічыцца прымяненне тэхнічных сродкаў у вучэбным працэсе. За апошнія гады ў гэтым напрамку нямала зроблена і ў нашым універсітэце. Аднак узровень выкарыстання тэхнічных сродкаў на лекцыйных, семінарскіх і практычных занятках яшчэ не адпавядае сучасным высокім патрабаванням. Вось чаму партыйная арганізацыя ўпраўлення універсітэта вырашыла абмеркаваць гэта пытанне на сваім чарговым сходзе. На яго былі запрошаны і прадстаўнікі з факультэтаў. Справаздачу аб рабоце лабараторыі тэхнічных сродкаў навучання зрабіў яе загадчык А. І. Карніенка. Заслухана таксама інфармацыя загадчыка лабараторыі вучэбнага тэлебачання З. Б. Айгарса аб праведзенай рабоце па падрыхтоўцы лабараторыі да запуску яе ў дзеянне.

На партыйным сходзе з заўвагамі і прапановамі па абмяркоўваемаму пытанню выступілі рэдактар шматтыражнай газеты У. П. Балога, загадчыца вучэбнага аддзела Н. І. Папкова, прарэктар па вячэрняму і завочнаму навучанню А. І. Балтоўскі, старшыня камісіі эканамічнага факультэта па ўкараненню тэхнічных сродкаў навучання, загадчык кафедры тэхнічных сродкаў апрацоўкі эканамічнай інфармацыі А. І. Іванюк, загадчык кафедры агульнай фізікі У. С. Стрыжнёў.

У прынятай на сходзе пастанове прадугледжаны меры па карэннаму паляпшэнню ўкаранення ў вучэбны працэс тэхнічных сродкаў навучання на ўсіх факультэтах універсітэта.

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат матэматычнага факультэта, кафедра алгебры і геаметрыі горача віншуюць намесніка дэкана матфака, кандыдата фізіка-матэматычных навук СЕЛЬКІНА Міхаіла Васільевіча з выпадку зацвярджэння яго ВАКам у вучоным званні дацэнта.**

*СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ*

# У БРАТНІМ САЮЗЕ

**У гэтым годзе наша краіна адзначае 60-годдзе ўтварэння СССР. Гэта свята ўсіх нацый і народнасцей нашай неабсяжнай Радзімы.**

**Ленінская ідэя стварэння СССР знайшла адабрэнне і гарачую падтрымку ў працоўных усіх савецкіх рэспублік. Яны разумелі, што толькі разам, у адзінай і братняй сям'і, змогуць абараніць заваёвы Кастрычніка і пабудаваць новае сацыялістычнае грамадства.**

23—27 снежня 1922 года ў Маскве адбыўся X Усерасійскі з'езд Саветаў. Ён прыняў пастанову аб утварэнні СССР, намеціў мерапрыемствы па развіццю народнай гаспадаркі і культурнага будаўніцтва, прыняў зварот да ўсіх народаў свету з заклікам аб'яднаць намаганні працоўных у барацьбе за мір.

X Усерасійскі з'езд Саветаў з'явіўся падрыхтоўчым крокам да склікання I з'езда Саветаў СССР. Ён адкрыўся 30 снежня 1922 года і стаў завяршальным этапам аб'яднання савецкіх рэспублік. I з'езд зацвердзіў Дэкларацыю і Дагавор аб утварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік і выбраў Цэнтральны Выканаўчы Камітэт СССР. У рабоце I з'езда Саветаў удзельнічалі 2215 дэлегатаў ад Расійскай Федэрацыі, Беларусі, Украіны, Закаўказскай Федэрацыі. Ад Гомельскай губерні ў рабоце I з'езда Саветаў удзельнічалі 33 дэлегаты.

У абласным дзяржаўным архіве захоўваецца шэраг цікавых матэрыялаў аб тым, з чаго пачыналася сацыялістычнае будаўніцтва ў гарадах і вёсках Гомельшчыны. Нашы землякі праяўлялі павышаную ўвагу да работы X Усерасійскага з'езда Саветаў, на якім прадстаўнікі ўсіх народаў маладой краіны перамогшага пралетарыяту вырашылі аб'яднацца ў братні Саюз.

Вось што запісалі ў пастанове аб'яднанага сходу члены прафесіянальных саюзаў Рэчыцы ад 10 студзеня 1923 года:

**«Адабраем пастанову з'езда і намечаныя шляхі далейшага будаўніцтва і вітаем Саюз Савецкіх Рэспублік, створаны на X з'ездзе Саветаў, як братняе яднанне працоўных Рэспублік у процівагу разлагаючайся Антанце».**

Паўсюдна ідэя стварэння СССР атрымлівала аднадушную падтрымку і адабрэнне. Працоўныя Гомельшчыны на сходах і канферэнцыях заяўлялі аб сваёй адданасці партыі бальшавікоў і Савецкай уладзе і запэўнівалі іх у сваёй гатоўнасці па першаму покліч у стаць на абарону Саюза Савецкіх Сацыялістычных рэспублік. Аб гэтым яскрава гавораць дакументы абласнога дзяржаўнага архіва тых гадоў:

**«Валасная канферэнцыя рабочых і сялян канстатуе, што дасягнуты поспехі нашай рэспублікі на знешнім і ўнутраных франтах дзякуючы цеснай і непарыўнай спайцы рабочых і сялян, якія заўсёды аказвалі актыўную падтрымку і чуйна прыслухоўваліся і адклікаліся на кліч рабоча-сялянскай улады. Вітаем стварэнне Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік і заяўляем, што ў далейшым усімі сіламі па першаму клічу гатовы на абарону і падтрымку рабоча-сялянскай улады».** (Пастанова Лоеўскай валасной беспартыйнай сялянскай канферэнцыі ад 14 студзеня 1923 года.

У перыяд утварэння СССР прадстаўнікі Саветаў з рэспублік і губерній удзялялі таксама ўвагу ўсталяванню мірных узаемаадносін паміж краінамі з розным сацыяльным ладам. Рабочыя запалкавай фабрыкі «Полымя рэвалюцыі» і завода «Чырвоны хімік» горада Гомеля на агульным сходзе заявілі: **«Вітаем утварэнне СССР як гарантыю нацыянальнага, культурнага самавызначэння і гаспадарчага адраджэння, якое забяспечвае краіну ад пагроз сусветнай рэакцыі».**

Прыведзеныя вышэй дакументы належаць гісторыі. Яны з новай пераканаўчай сілай гучаць напярэдадні юбілею — 60 годдзя СССР. Наша краіна прайшла шасцідзесяцігадовы шлях барацьбы і перамог, прадэманстравала ўсяму свету ўзор братняй садружнасці раўнапраўных нацый і народнасцей у адзінай савецкай сацыялістычнай шматнацыянальнай дзяржаве.

**В. ЛУГАЎСКАЯ,**
**загадчыца аддзела аблдзяржархіва.**

*Гутарка на актуальную тэму*

# ЭКАНОМІЯ І БЫТ

**У нашым універсітэце з лекцыямі перад студэнтамі і выкладчыкамі рэгулярна выступаюць вядучыя вучоныя краіны. З эканамічным факультэтам цесныя сувязі падтрымлівае доктар эканамічных навук, загадчык лабараторыі Акадэміі народнай гаспадаркі СССР Р. В. Гаўрылаў. Рудольф Васільевіч падрыхтаваў для нашай газеты артыкул «Эканомія і быт», які мы прапануем увазе чытачоў.**

РЭЖЫМ эканоміі ў быце нельга зводзіць толькі да ашчаднасці. Эканамічнае паняцце «рэжым эканоміі» шырэй, чым паняцце «ашчаднасць». Ашчаднасць у прамым сэнсе — гэта недапушчэнне псавання кватэры, ломкі поручняў, ліфтоў, вокнаў, безгаспадарчасці ў калектыўным двары. Рэжым жа эканоміі ўключае, акрамя ўсяго гэтага, яшчэ і планаванне расходу сродкаў на ацяпленне, асвятленне, водазабеспячэнне, рамонт памяшканняў і камунікацый, утылізацыю бытавых другасных рэсурсаў. Аднак і рэжым эканоміі, і ашчаднасць у нашым быце маюць адну эканамічную прыроду, і іх прызначэнне — не дапускаць дарэмных расходаў. Прадухіленне дарэмных дадатковых расходаў на нашу хатнюю ўтульнасць— вось у чым заключаецца эканамічная прырода рэжыму эканоміі і ашчаднасці ў быце.

Мэтай эканоміі ў быце з'яўляецца максімальнае зніжэнне страт з-за безгаспадарчасці. Работнікі жыллёва-камунальнай гаспадаркі справядліва кажуць, што ў дрэнных кватэраздымшчыкаў вельмі шмат «малых страт». Такіх фактаў у жыцці істотна больш, чым іх магло б быць. Узнікаюць яны як ад неахайнасці, так і ад няўмення весці хатнюю гаспадарку. Ёсць у нас і такія людзі, якія «грэюць вуліцу зімой» і «забіваюць цвікі мікраскопам». Большасць такіх выпадкаў нельга апраўдаць, яны проста з'яўляюцца фактамі неашчадных адносін да нашага жылля.

У нашым быце ў розных размерах практычна страчваецца ўсё: ад макулатуры і харчовых адходаў да вады і цяпла. Асноўныя метады рэжыму эканоміі і ашчаднасці ў жыллёва-камунальнай гаспадарцы — прымяненне навукова-абгрунтаваных норм расходу электраэнергіі, цяпла, гарачай і пітной вады, газу; своечасовае выкарыстанне дасягненняў тэхнікі і новых тэхналогій яе прымянення ў быце; стварэнне належнага ўліку і захавання матэрыяльных каштоўнасцей; захаванне парадку ў эксплуатацыі жыллёва-камунальнай тэхнікі і абсталявання; ліквідацыя безгаспадарчасці, варварскіх адносін да прадметаў, якія ствараюць наш дабрабыт.

Прымяняльна да жыллёва-камунальнай гаспадаркі і нашага быту выдзяляюцца такія галоўныя шляхі эканоміі, як прымянне новых сродкаў, прыстасаванняў і спосабаў вытворчасці неабходных для насельніцтва бытавых паслуг; ашчаднае і разумнае расходаванне сродкаў, рэалізацыя прынцыпа — правільна эксплуатуй памяшканні, бытавыя камунікацыі і г. д. У цэлым — гэта бар'ер для безгаспадарчасці. Да яго адносяцца нарміраванне, улік і кантроль. І апошні шлях — гэта выкарыстанне разнастайных бытавых адходаў: макулатуры, металу, тэкстыльных матэрыялаў, харчовых адходаў і здача іх прадпрыемствам «Уторсыравіны».

Рэжым эканоміі і ашчаднасць у быце — састаўныя часткі сацыялістычнага ладу жыцця. Яны маюць агульныя і спецыфічныя рысы ў параўнанні з эканоміяй у матэрыяльнай вытворчасці. Агульнае ў тым, што ашчаднае расходаванне матэрыяльных рэсурсаў і ўмелае спажыванне нематэрыяльных паслуг азначаюць народнагаспадарчае захаванне сродкаў вытворчасці і рабочага часу, з дапамогай якіх яны ствараюцца. Эканомнае выкарыстанне прадметаў і рэчаў нашага быту прыводзіць да іх накаплення і стварэння запасаў так як і ў матэрыяльнай вытворчасці. І, наадварот, ашчаднае выкарыстанне «нематэрыльных рэчаў», напрыклад, цяпла і электраэнергіі з-за іх фізічнай прыроды не дазваляюць іх накапліваць і стварыць рэзервныя запасы.

Цяпер у народнай гаспадарцы нашай краіны разгортваецца ўсесаюзны агляд выкарыстання рэзерваў эканоміі. Рух за ашчаднасць у вялікім і малым набірае тэмпы. Наша эканоміка павінна быць эканомнай. Рашучы паварот да дасягнення гэтай мэты робіць і жыллёва-камунальная гаспадарка. Наш савецкі быт таксама павінен быць эканомным і ашчадным.

**Р. ГАЎРЫЛАЎ,**
**доктар эканамічных навук, загадчык лабараторыі Акадэміі народнай гаспадаркі СССР.**

*Да працоўнага семестра—82*

# АКТЫЎНАЯ ПАДРЫХТОЎКА

Працягваецца падрыхтоўка да чарговага працоўнага семестра. Зараз ідзе фарміраванне атрадаў, выпрацоўка праграм іх работы, грамадскай дзейнасці, прыняцце статутаў. Рыхтуецца да працы інтэрнацыянальны студэнцкі будаўнічы атрад. У ім, як заўсёды, будзе дзве групы. Першая (камандзір А. Васільеў, камісар Т. Парахня) выедзе на работу ў Чэхаславакію, другая (камандзір І. Кекіш, камісар В. Караткі) — будзе працаваць на адным з будаўнічых аб'ектаў Гомеля.

Пачалася і дагаворная кампанія: разам з кіраўніцтвам тых прадпрыемстваў, будоўляў, гаспадарак, дзе будуць працаваць будаўнічыя атрады і атрады іншых напрамкаў дзейнасці, вызначаецца аб'ём работы, тэрміны яе выканання. Сёлета атрады студэнтаў нашага універсітэта раз'едуцца ў розныя куткі вобласці, выедуць у братнія рэспублікі — РСФСР і Малдаўскую ССР. Будаўнічы атрад будзе працаваць на Пскоўшчыне, у Малдавіі —два атрады несельскагаспадарчага напрамку. У нашай вобласці— дапамогуць рэканструяваць «Гомсельмаш», будаваць меліярацыйныя аб'екты. У рамках выканання намечанай партыяй харчовай праграмы студэнцкія атрады прымуць удзел у будаўніцтве ферм па адкорму буйной рагатай жывёлы. Можна будзе ўбачыць студэнцкія атрады на кансервавых заводах Гомеля, Хойнік, Капцэвіч, на Кармянскім і Петрыкаўскім камбінатах будаўнічых матэрыялаў, у складзе механізаваных сельскагаспадарчых атрадаў, у вагонах чыгункі, на борце самалёта. Плануецца заключыць дагаворы аб доўгатэрміновым супрацоўніцтве з ПМК-37 (г. п. Акцябрскі), ПМК-72 (г. п. Парычы), ПМК-69 (г. п. Уваравічы), трэстам «Гомельводбуд», саўгасам «Запаветы Ільіча» аб'яднання «Саюзэфіралей».

З мэтай паспяховай падрыхтоўкі студэнцкіх атрадаў да выканання вытворчых і грамадска-палітычных задач камітэт камсамола універсітэта наладзіў вучобу кіраўнікоў студэнцкіх атрадаў у школах камсамольскага актыву. Заняткі ў школах кіраўнікоў студэнцкіх атрадаў пачаліся ў лютым і будуць закончаны ў канцы красавіка. Для правядзення заняткаў на высокім узроўні запрошаны найбольш вопытныя арганізатары студэнцкіх атрадаў, камсамольскія актывісты, спецыялісты народнай гаспадаркі, выкладчыкі вучэбных устаноў. На базе універсітэта пройдуць навучанне лектары, піянерскія важатыя, рэдактары насценных газет; у БІІЧТу — майстры і брыгадзіры студэнцкіх атрадаў; у музычным вучылішчы — кіраўнікі агітбрыгад; у медыцынскім вучылішчы — урачы лінейных атрадаў.

Студэнты нашага універсітэта выступілі з каштоўнымі ініцыятывамі. Вырашана стварыць два шэфскія атрады па тыпу легендарных атрадаў А. С. Макаранкі. У кожным атрадзе будзе камандзір, камісар, два выхавацелі, якія пачнуць працаваць з так званымі «цяжкімі» падлеткамі.

Плануецца стварыць ва універсітэце школу сельскагаспадарчага напрамку, дзе адпаведную падрыхтоўку атрымаюць камандзіры і камісары сельгасатрадаў, якія фарміруюцца ў тэхнікумах нашага горада.

**У. ЧМЫХ,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта.**

# СЕМІНАР МАЛАДЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ

Стала добрай традыцыяй праводзіць у студзені кожнага года тэарэтычныя семінары па педагогіцы і псіхалогіі з маладымі выкладчыкамі ГДУ. Мэта такіх семінараў — даць іх слухачам псіхолага-педагагічныя веды па методыцы арганізацыі вучэбна-выхаваўчай работы са студэнтамі, аказаць дапамогу маладым выкладчыкам у авалодванні педагагічным майстэрствам.

З дакладам на семінары, які праходзіў нядаўна ва універсітэце, выступіў загадчык кафедры педагогікі і псіхалогіі прафесар І. Ф. Харламаў. Ён расказаў аб асноўных заканамернасцях пазнавальнай дзейнасці студэнтаў у авалодванні вывучаемага матэрыялу, і як гэтыя заканамернасці адлюстроўваюцца ў методыцы вузаўскага навучання.

Асаблівасцям навуковай арганізацыі працы выкладчыка ВНУ прысвяціў свае выступленне дацэнт кафедры педагогікі і псіхалогіі Р. М. Аўчыннікаў. Праблема пераемнасці паміж ВНУ і школай у развіцці гнастычных асноў вучэбнай работы студэнтау была раскрыта ў дакладзе выкладчыцы кафедры англійскай мовы С. І. Сокаравай.

На семінары былі закрануты пытанні псіхалагічнага характару. У прыватнасці, дацэнт М. І. Мурачкоўскі выступіў з дакладам на тэму «Памяць, яе асноўныя віды і роля ў працэсе авалодвання вывучаемым матэрыялам».

Як вядома, працэс навучання толькі тады садзейнічае ўсебаковаму развіццю будучых спецыялістаў, калі ён дапаўняецца змястоўнай выхаваўчай работай са студэнтамі. Менавіта таму ў план семінара былі ўключаны даклады аб арганізацыі работы куратараў студэнцкіх груп і методыцы фарміравання студэнцкага калектыву як важнага фактара камуністычнага выхавання моладзі. Гэта пытанне асвятлялася ў дакладах кандыдата педагагічных навук Л. Н. Сечкі і аўтара гэтых радкоў.

Семінар прайшоў цікава, з вялікай карысцю для слухачоў, аб чым сведчыць тая ўвага, з якой маладыя выкладчыкі слухалі выступленні лектараў. Пажадана было б у далейшым прыцягваць да ўдзелу ў семінары не толькі калектыў кафедры педагогікі і псіхалогіі, але тых выкладчыкаў з іншых кафедр ГДУ, якія маюць вялікі практычны вопыт работы са студэнтамі.

**Ф. КАДОЛ,**
**в. а. дацэнта кафедры педагогікі і псіхалогіі.**

# АРГАНІЗУЕЦЦА КУЛЬТПАХОД

У гэтым месяцы на экраны кінатэатраў горада Гомеля выходзіць двухсерыйны шырокафарматны каляровы мастацкі фільм «Коней на переправе не мяняюць».

Гэты глыбокі па сэнсу і яркі па мастацкаму выкананню кінафільм раскрывае характары нашых сучаснікаў, акцэнтуе ўвагу гледачоў на праблемах маральнага выхавання, праблемах канфліктных сітуацый.

Калектыўны прагляд фільма студэнтамі ГДУ адбудзецца 15 лютага ў кінатэатры імя Калініна.

